Зубчонак, Н. А.
Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906—1916 гг.) : дапам. для студэнтаў Інстытута журналістыкі,
/ Н. А. Зубчонак. Мінск ; БДУ, 2010.

### 2.2.3. НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ Ў ДРУКУ

Перыяд спаду рэвалюцыі, жорсткія ўмовы палітычнай рэакцыі, першая сусветная вайна сталі для беларускага друку выпрабаваннем на трываласць — у першую чаргу, ідэйную. Дзесяцігоддзе, якое папярэднічала кастрычніку 1917 г., дазволіла ажыццявіць паралом у свядомасці беларусаў, вызначыць рысы ўласнага гістарычнага шляху развіцця, закласці асновы пабудовы новай дзяржавы, сфарміраваць палажэнні нацыянальнай ідэі.

Адлюстраваннем рэвалюцыйна-дэмакратычных пераўтварэнняў у краіне была публіцыстыка. На старонках беларускіх нацыянальных выданняў, газет буржуазна-дэмакратычнага напрамку, у партыйным друку, у рэакцыйных газетах і часопісах з'явіліся матэрыялы, якія сведчылі аб тым, што ў Паўночна-Заходнім краі адбываюцца інтэнсіўныя працэсы, накіраваныя на афармленне асобнай нацыянальнай дзяржавы. Публіцыстыка беларускіх выданняў з'явілася пацвярджэннем таму, што правінцыйны друк пастуова вызваляўся ад прамой залежнасці і непасрэднага ўплыву сталічнай расійскай прэсы. Беларускі друк — гэта асобная сістэма, якая з цягам часу набывае свае адметнасці, развіваецца па ўласных законах, уплывае на грамадскі працэс.

Нельга не пагадзіцца, што тагачасная Беларусь знаходзілася ў вельмі складаных сацыяльна-палітычных умовах. Па-першае, дзяржава не мела нават назвы і афіцыйна была пазначана як Паўночна-Заходні край. З пункту гледжання дня сённяшняга, адсутнічалі самыя мізэрныя рысы яе як этнічнай адзінкі. Больш таго, у адносінах да нашай краіны не існавала і спецыяльных законаў, якія б вызначалі яе як нацыянальны рэгіён з асобным прававым становішчам. Сёння гісторыкі ўказваюць на тое, што «кансалідацыя беларускай нацыі не падмацоўвалася згуртаваннем у межах нацыянальнай дзяржавы» [41, с. 4], вельмі часта з парушэннем нацыянальных правоў сутыкаліся тыя, хто быў непасрэдна звязаны са сферай духоўнага жыцця. Аднак гэтыя фактары не спынілі заканамерны працэс – у краі развівалася нацыянальная свядомасць.

Вышэй адзначалася, што галоўнай адметнасцю сістэмы беларускай прэсы міжрэвалюцыйнага перыяду было з'яўленне і развіццё цэлага шэрагу нацыянальных беларускіх выданняў. Яны

вызначалі грамадскую думку, звярталі ўвагу тагачаснай публіцыстыкі да важнейшых праблем сацыяльнага жыцця ў краіне. Вакол газет і часопісаў на роднай мове згуртаваліся прадстаўнікі самых розных грамадска-палітычных кірункаў і рухаў. Іх публіцыстычныя матэрыялы часта былі непасрэднай рэакцыяй на публікацыі беларускіх нацыянальных выданняў і, зразумела, на ідэйныя погляды адзінай у той час нацыянальнай дэмакратычнай партыі — Беларускай сацыялістычнай грамады.

У час нарастання сацыяльных, палітычных, эканамічных супярэчнасцей, супрацьстаяння розных партый, кожная з якіх ставіла перад сабой задачу перабудовы грамадскага ладу, паступова выкрышталізоўвалася праблема незалежнасці Беларусі. Перыяд рэвалюцыйных зрухаў, з аднаго боку, заўсёды параджае ў народзе пачуццё страху, няўпэўненасці ў сваіх сілах, у сваёй будучыні, а з другога – выклікае да жыцця самыя прагрэсіўныя памкненні, сутнасць якіх у большасці сваёй часта звязана з этнічнымі, нацыянальнымі, рэлігійнымі поглядамі. Паступова людзі пачынаюць разумець, што рэалізаваць задуманае, сцвердзіць нарэшце сябе як асобную нацыю, яны змогуць толькі ва ўласным доме, у сваёй дзяржаве. Імкненне ж нацыі да самастойнасці будзе мець самыя катастрафічныя вынікі для магутнай дзяржавы, якая трымае ў сваім падпарадкаванні асобныя народы, якая за іх жа кошт ажыццяўляе сваю палітыку. Расійская імперыя ва ўсе часы будавала сваю дзяржаўнасць на аснове непадзельнасці, на адзінстве самадзяржаўнай улады і праваслаўнай веры. З цягам часу гэтыя прынцыпы перараслі ў трывалую рускую нацыянальную ідэю, у якой «захлынуліся» іншыя нацыі.

Паняцце «нацыянальнай ідэі» вельмі важнае для кожнага народа. У розныя перыяды гісторыі прадстаўнікі інтэлігенцыі імкнуліся сфармуляваць яе, улавіць сэнс. І калі гэта ўдавалася, дзяржава станавілася магутнай, і сіла яе заключалася менавіта ў адметнасці, у лепшых рысах, нацыянальнага характару. У спробе пераасэнсаваць сваю эпоху, высветліць яе заганы і памылкі часам нараджаліся самыя прагрэсіўныя ідэі, знаходзіліся шляхі выхаду з глыбокага і зацяжнога крызісу.

У пачатку XX ст. падзеі рускай рэчаіснасці выйшлі за межы Расіі і набылі сусветны характар. І тое, што імперыя апынулася перад распадам, а беларусы ўзяліся за згуртаванне сваіх сілаў дзеля нацыянальнага адраджэння, было абсалютнай заканамернасцю. Невялікаму народу гісторыя прапанавала шанс, ад рэалізацыі якога залежыла яго будучыня.

З часоў Вялікага княства Літоўскага Беларусь не мела дзяржаўнай самастойнасці. У розныя перыяды гісторыі пад уплывам пэўных падзей народ зноў і зноў губляў магчымасць стварыць самастойную дзяржаву. Нестабільнасць расійскай палітыкі ў пачатку XX ст. спрыяла ажыццяўленню гэтай задумы. Рэвалюцыя 1905 г. аслабіла дзяржаўную

сістэму кіравання. Нягледзячы на тое, што ўрад прадпрымаў шэраг мер, каб захаваць уладу, было зразумела, што да былых прынцыпаў жыццядзейнасці Расійская імперыя не зможа вярнуцца. Пазней гісторыя пацвердзіла гэта меркаванне. Рэакцыйная палітыка міжрэвалюцыйнага перыяду была апошнім праяўленнем улады напярэдадні вялікіх змен. Падзеі першай сусветнай вайны канчаткова разбурылі апоры царызму.

Перш чым звярнуцца непасрэдна да тых палажэнняў, якія прапаноўвалі прадстаўнікі беларускага адраджэння, колькі слоў неабходна сказаць пра духоўнае светаадчуванне народа ў пачатку XX ст., пра вытокі яго светаўспрымання. Важна адчуць і зразумець характар ментальнасці нацыі, каб потым мець магчымасць растлумачыць паходжанне пэўных ідэй, меркаванняў, якія прапанавалі беларуская літаратура і публіцыстыка адраджэнцкай пары.

Тэрыторыя Беларусі па прычыне свайго геаграфічнага становішча стала аб’ектам спрадвечных дамаганняў з боку Польшчы і Расіі. Суседнія краіны прыкладалі шмат сіл, каб перацягнуць мясцовае насельніцтва на свой бок. Зразумела, усё гэта адмоўна ўплывала на гістарычны лёс народа. Лічылася, што беларусы быццам бы не маюць будучага, ім уласцівы песімістычнае, трагічнае светаўспрыняцце. Такой думкі прытрымліваліся многія вучоныя. Напрыклад, свае меркаванні адносна беларускага этнасу Л. Гумілёў падмацоўваў прыкладам з рамана У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха», адзін з герояў якога лічыў свой народ няшчасным, непрыкаяным, аддадзеным сваімі ўладарамі на здабычу чужынцам [23, с. 371].

М. Гарэцкі ў «Гісторыі беларускай літаратуры», аналізуючы яе нашаніўскі перыяд, указваў на «балючае адчуванне спрадвечнай нязрушнасці сялянскіх мас у справе сацыяльна-нацыянальнага ўсведамлення», але, у той жа час, падрэсліваў «погляд на тыя масы, як на адзіны грунт і падставу для нашаніўскае работы» [18, с. 171].

Сапраўды, у беларусаў было мала прычын ідэалізаваць мінулае і спадзявацца на будучае. Заўсёды стаяла праблема выжывання, прысутнічала адчуванне пастаяннай пагрозы свайму існаванню, барацьба супраць сацыяльнага і нацыянальнага ўціску. Гэта давала магчымасць больш уважліва ўспрымаць усё акаляючае, што станавілася жыццём, служыла апорай існавання, дапамагала беларускаму народу вытрымліваць удары лёсу. «Гэта светаадчуванне і прадвызначыла ў новых гістарычных умовах наступаючай эпохі рэвалюцыйных зрухаў і хваляванняў, вострай ідэйнай барацьбы і духоўных пошукаў абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, яго імкненне вызначыць уласныя шляхі сацыяльнага і духоўнага развіцця, заняць сваё месца ў гісторыі» [16, с. 58].

Складанасць і асаблівасць палітычных умоў гэтага часу ў Паўночна-Заходнім краі заключалася ў тым, што неабходна было пачынаць стварэнне абсалютна новай дзяржавы, і пачынаць амаль на

пустым месцы. Грамадскія сілы, якія павінны былі ажыццяўляць гэтую работу, былі вельмі слабыя (вышэй падкрэслівалася, што нацыянальная інтэлігенцыя толькі пачынала фарміравацца). У самым пачатку было шмат доказаў, што ў такіх умовах беларусы наўрад ці змогуць скарыстаць свой шанс.

Сёння грамадству зразумела, што адраджэнне нацыянальнай мовы, стварэнне беларускай школы — гэта праца не аднаго дня. Не выключана, што на гэта можа спатрэбіцца жыццё не аднаго пакалення. Аднак важнасць і сіла тых духоўных змен, якія пачыналі ажыццяўляцца на Беларусі ў пачатку XX ст., заключалася ва ўсведамленні, што беларускую нацыянальную справу неабходна абавязкова пачынаць. Гэта і стала першым крокам да выхавання свядомасці нашага народа, шляхам да стварэння ўласнай нацыянальнай ідэалогіі. Культурнае адраджэнне, задачу якога ставілі на першае месца прадстаўнікі беларускага руху, паступова выходзіла за межы культуралагічных праблем і станавілася часткай ідэалогіі беларускага народа. У сувязі з гэтым «Наша ніва» пісала: «Еўрапейская культура, паўшы на нацыянальную глебу, выяўляе асаблівасці нацыі, яе характар і псіхалогію. Гэты асобны характар і псіхалогія ствараюць нацыянальную ідэалогію» [«Наша ніва», 1913, № 34].

Ідэя нацыянальнага адраджэння ўзнікла ў міжрэвалюцыйны перыяд у выніку росту нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Неабходнасць яе ўзнікнення была запатрабавана самім часам — важна было знайсці шляхі выратавання свету і чалавека ад пагрозы катастрофы і духоўнага тупіка, аб'яднаць народ, гарантаваць яго далейшае існаванне і развіццё. Паступова нацыянальная ідэя пачала атаясамлівацца з «усвядомленым разуменнем своеасаблівасці гістарычнага шляху таго ці іншага народа, і, такім чынам, яна выступіла як вызначаная, сфарміраваная нацыянальная свядомасць са сваімі духоўнымі каштоўнасцямі і арыенцірамі» [16, с. 61].

Паколькі ў сваіх развaжаннях мы паглыбіліся ў сутнасць гэтых вызначальных для пачатку стагоддзя паняццяў, то неабходна яшчэ раз звярнуць увагу на некаторыя асаблівасці ў разуменні сутнасці нацыянальнай ідэі беларусаў. Па-першае, яе не трэба атаясамліваць са светапоглядам у цэлым, паколькі яго развіццё абумоўлена ўсёй сукупнасцю фактараў існавання таго ці іншага канкрэтнага этнасу. Па-другое, светапогляд жа ўяўляе сабой сістэму розных прынцыпаў і ўяўленняў, якія заглыбляюцца сваімі каранямі ў асяроддзе жыхарства, гісторыю і культуру пэўнага этнасу.

І яшчэ на адну акалічнасць неабходна звярнуць увагу: «Нацыянальная свядомасць набывае форму ідэі ў тым выпадку, калі нацыянальны элемент у сілу тых або іншых прычын (як мы гэта бачылі на прыкладзе вялікарускага этнасу) пачынае высоўвацца на першы план і адыгрываць дамінуючую ролю» [16, с. 61].

Заклікі да адраджэння дзяржавы, яе мовы, культуры ў пачатку XX ст. былі нічым іншым, як праяўленнем нацыянальнай ідэі. Паступова да светаадчування народа, якое сваімі каранямі адыходзіць як у гісторыю, так і ў этнічную культуру, далучаецца яшчэ адзін элемент — ідэалагічны. Светаадчуванне становіцца фактарам грамадскага жыцця і культуры, перарастае ў светапогляд. Адлюстраваннем жа нацыянальнай ідэалогіі пачатку стагоддзя стала беларуская публіцыстыка, тыя газеты і часопісы, на старонках якіх занатаваліся яе асноўныя палажэнні. Афармленню нацыянальнай ідэі спрыяў таксама агульны публіцыстычны фон, які склаўся на тэрыторыі нашай краіны пасля 1905 г. У спрэчках са шматлікімі чарнасоценнымі выданнямі, з газетамі і часопісамі ліберальна-буржуазнага і клерыкальнага напрамкаў ідэя беларускага нацыянальнага адраджэння набывала сваю адметнасць, яна была заўважана. У рэшце рэшт, напад на беларускае адраджэнне — гэта адно з праяўленняў страху перад моцнай ідэалогіяй, сіла якой заключалася перш за ўсё ў прывязанасці да сваіх нацыянальных каранёў, традыцый, да мовы і культуры свайго народа.

Ідэя нацыянальнага адраджэння знайшла падтрымку ў народа. Адраджэнская літаратура і публіцыстыка сталі даступнымі і зразумелымі, яны былі праяўленнем спрадвечных памкненняў людзей да лепшага жыцця, да незалежнасці і самастойнасці. Кожнай дзяржаве абавязкова патрэбна нацыянальная ідэя. Гэта сэнс і мэта яе існавання. Гэта добра разумелі адраджэнцы пачатку XX ст.

Беларускае нацыянальнае адраджэнне не ставіла перад сабой неажыццявімых мэт. Духоўныя пошукі пісьменнікаў і публіцыстаў мелі рэальнае паходжанне і прызначэнне, народнае светаадчуванне стала асновай адраджэння. Яно не было адчуваннем слабай нацыі, паколькі змагло запоўніць сабой абсалютна ўсю ідэалагічную прастору на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю.

Развіваць нацыянальную культуру, атрымліваць адукацыю на роднай мове, удасканальваць эканоміку, рэалізоўваць свае палітычныя правы беларускі народ зможа тады, калі будзе мець уласную дзяржаўнасць. Нацыянальны перыядычны друк распрацоўваў праграму перспектыўнага дзяржаўнага будаўніцтва сваёй краіны. Асноўны змест публіцыстычных выступленняў супадаў з праграмнымі палажэннямі БСГ, пад кіраўніцтвам якой у дадзены перыяд ажыццяўляўся нацыянальны рух у Паўночна-Заходнім краі.

Не адразу грамадская думка прыйшла да ўсведамлення неабходнасці ўсталявання суверэнітэту. Доўга перыядычны друк, асвятляючы выбары ў Дзяржаўную думу, яе работу, звязваў свае надзеі з новым урадам. З цягам часу стала зразумела, што практычна ніводная з палітычных партый не была зацікаўлена ў вырашэнні нацыянальнай праблемы ў Беларусі. На працягу першых трох гадоў выдання такія матэрыялы пераважалі ў «Нашай ніве». Прыблізна ў 1910-х гг. сітуацыя пачала змяняцца. Газетныя выступленні паступова набывалі

неабходную праблемнасць, вастрыню, канкрэтнасць. У асяроддзі публіцыстыкі зараджалася ідэя неабходнасці самавызначэння.

Зыходзячы са зместу беларускай публіцыстыкі, гісторыю яе развіцця ўмоўна можна падзяліць на некалькі этапаў. За аснову, зразумела, трэба ўзяць «Нашу ніву», паколькі менавіта гэтае выданне кіравала нацыянальным грамадска-палітычным працэсам у Паўночна-Заходнім краі.

Першы этап доўжыўся прыкладна з 1906 да 1910 г. У гэты час беларускія перыядычныя выданні ўздымалі культурна-асветніцкія праблемы. Распрацоўвалася ідэя неабходнасці заснавання нацыянальнай школы, адкрыцця нацыянальнага універсітэта, арганізацыі навучання дзяцей на беларускай мове; адстойваліся правы беларускай мовы ў касцёле; шмат матэрыялаў прысвячалася палажэнню жыцця і працы сельскіх гаспадароў. Побач з гэтым існавала надзея заваяваць пэўную колькасць месцаў у Дзяржаўнай думе, паслаць туды дэпутатаў «з народа», якія будуць змагацца за правы беларусаў.

Паступовa нарастаючы эканамічны крызіс у Еўропе, пагроза сусветнай вайны, далейшае нагнятанне рэакцыі ў Расіі значна паўплывалі на грамадска-палітычную думку. Рэчаіснасць патрабавала рашучых прапаноў і дзеянняў. Змест беларускай публіцыстыкі мяняўся, станавіўся больш радыкальным.

Больш настойлівымі зрабіліся заклікі да адраджэння, абуджэння нацыянальнай свядомасці, вяртання пачуцця нацыянальнай годнасці. У чарговай палеміцы з чарнасоценнай «Белорусской жизнью» у 1911 г. «Наша ніва» пісала: “Белорусская жизнь” думае іначай: досыць у беларусаў адабраць іх родную мову і прышчапіць расійскую, і тады “славянские ручьи сольются в русском море”... Толькі страшэнная пагарда да людской душы можа дыктаваць формулу: забудзь, народ, аб сабе, забудзь аб сваёй веры, мове, красе, забудзь песні свае і замяні сваю душу на чужую душу!» [«Наша ніва», 1911, № 4]. І далей выданне заяўляла, што будзе прытрымлівацца такіх пазіцый.

Адным з першых сур’ёзных крокаў сталі выступленні газет у абарону правоў беларусаў. Больш таго, з самага пачатку пазіцыя выданняў у гэтым напрамку была пазбаўлена нацыяналістычнага ці шавіністычнага ўхілу. Беларускія публіцысты заявілі, што будуць цвёрда прытрымлівацца сваіх перакананняў, не выступаючы супраць іншых народаў, калі толькі тыя не стануць пасягаць на незалежнасць краіны. «Мець нянавісць да палякаў за тое, што яны палякі, да рускіх за тое, што яны рускія, можа толькі ці хворы на розум чалавек, ці той, у каго мазгі моцна засораны фальшывым патрыятызмам» [«Наша ніва», 1911, № 5].

З гэтага часу ў беларускім перыядычным друку ўсё часцей з’яўляецца паняцце «нацыянальная ідэя», гучаць разважанні аб тым, ці варта нам, беларусам, развіваць сваю культуру, ці лепш засвоіць здабыткі расійскай або польскай. І ўвогуле, ці маем мы права быць

беларусамі. Пад такой назвай у 1912 г. «Наша ніва» ў некалькіх нумарах змясціла матэрыял, у якім прапаноўвала ўласнае бачанне сутнасці нацыянальнай ідэі (дарэчы, спасылаючыся на працы вядомых расійскіх вучоных), у рэшце рэшт, яе неабходнасці для развіцця любога народа, і не толькі беларускага: «У гэтым сталецці мы бачым, як нацыянальная ідэя пачынае развівацца з небывалай сілай і пачынае шырыцца між новымі і новымі народамі... У гэтым сталецці тая ідэя даходзіць бадай што да найбольшага пункту свайго развіцця, – і пачне, як і кожная лепшая думка пры злучэнні з жыццём, сходзіць на благія сцежкі і рабіцца ўжо шкоднай не толькі для развіцця духоўнай культуры, поглядаў, але і для складанага жыцця паміж людзьмі розных народаў, што жывуць і працуюць пабач» [«Наша ніва», 1912, № 22].

Працэс самавызачэння народаў, імкнення да самастойнасці ва ўсе часы меў і негатыўны бок, бо жаданне адных развіваць сваю культуру і дзяржаўнасць падрывала стабільнасць пануючай краіны, прама супярэчыла яе задачам і інтарэсам. Шлях да незалежнасці тых народаў, якія некалі ўваходзілі ў склад іншых дзяржаў, вельмі цяжкі, няпросты.

Не адно пакаленне вучоных на працягу доўгага часу сцвярджала, што з самага пачатку цывілізацыі чалавецтва сваё пастyпальнае развіццё ажыццяўляе толькі праз народы. Менавіта ў асобнасці і адметнасці кожнай нацыі і заключаецца каштоўнасць чалавечага існавання на зямлі. Знішчэнне асаблівасцей пэўнай культуры ці зліццё яе з іншай нанясе вялікую шкоду не толькі нацыянальнай культуры, але і сусветнай. Публіцысты сталі рашуча выступаць супраць расійска-польскай асіміляцыі беларусаў, якая напачатку XX ст. не проста працягвалася, а перайшла ўжо на новую стадыю.

Беларускія друкаваныя выданні змясцілі мноства матэрыялаў, у якіх даказвалася, што ствараць культурныя рэчы сусветнай вартасці можна выключна на сваёй роднай мове, што рост агульнага ўзроўню нацыі адбываецца толькі праз развіццё яе асаблівасцей, а не праз іх знішчэнне. У працэсе асіміляцыі, калі чужыя традыцыі насаджаюцца гвалтам, не можа быць свабоднага развіцця і ўзаемапранікнення. Культура больш моцнага народа знішчыць культуру народа меншага і слабейшага. Развіваць яе, выяўляць свае творчыя здольнасці кожная нацыя можа толькі тады, калі атрымае ці заваюе на гэта права. У пацвярджэнне гэтых меркаванняў «Наша ніва» пісала: «Беларусь, калі жыла сваім асобным культурным жыццём, была дужа культурнай. Калі ж толькі пачала асімілявацца беларуская інтэлігенцыя, “вярхі народу”, – край пачаў з кожным годам усё падаць і падаць... Цёмны, забіты, загнаны народ загубіў не толькі пачуццё сваёй грамадзянска-палітычнай вартасці, сваёй асобнасці, але і пачуццё чалавечай вартасці» [«Наша ніва», 1912, № 26].

Беларуская публіцыстыка пачатку XX ст. рабіла шмат і для справы інтэрнацыяналізацыі айчыннай культуры. Імкненне беларусаў знайсці сваё месца ў сусветным культурным і гістарычным працэсе

прыводзіла да пашырэння беларускага руху, да ўключэння яго ў міжнацыянальны кантэкст. У 1909 г. «Наша ніва» надрукавала артыкул «Беларусы і нацыянальнае адраджэнне», аўтарам якога быў вядомы ўкраінскі вучоны і грамадскі дзеяч Д. Дарашэнка. Ён пісаў: «Беларускі нацыянальны рух яшчэ надта малады. Якая будзе яго далейшая доля, залежыць ад таго, ці знойдзецца ў беларусаў досыць сілы, каб перамагчы ўсе перашкоды... Але той водгук, які здабыло сабе першае друкаванае слова ў народных масах, можа служыць добрым знакам для ўсяго беларускага руху, які ідзе ўперад пад штандарам шчырага дэмакратызму і думак аб шырокім вызваленні» [«Наша ніва», 1909, № 4]. У прадмове да публікацыі рэдакцыя адзначыла, што паступова беларуская нацыянальная справа пачынае шырыцца, ёю цікавяцца суседнія народы, а значыць, ёсць надзея на паспяховае завяршэнне.

З 1910-х гг. развіццё публіцыстыкі перажывае пэўны ўздым, паступова змяняецца яе змест. Варта адзначыць, што гэтыя змены датычыліся не толькі беларускіх нацыянальных выданняў. З новай сілай узнімаюць галаву разнастайныя чарнасоценныя газеты і часопісы тыпу «Крестьянина», «Белорусской жизни» і інш. З аднаго боку, гэта спрыяла таму, што публіцыстычныя матэрыялы беларускіх легальных выданняў становяцца больш вострымі і праблемнымі, больш ясна бачыцца мэта – адраджэнне ўласнай нацыянальнай дзяржавы.

З другога боку, усё нарастаючы ідэалагічны націск на беларускі рух не змог не паўплываць на змест публіцыстыкі. Дэкадэнцкі настрой бездапаможнасці, бяссілля, цемнаты і невуцтва прадаўжала новая хваля сумненняў. Беларуская інтэлігенцыя пастаянна задавала сабе пытанне: ці маюць беларусы права называцца нацыяй. У шэрагу матэрыялаў гучаў адказ – маюць. Паласа гэтых разважанняў працягвалася да самага канца выхаду газет. Прысутнасць матываў сумнення, няўпэўненасці ва ўласных сілах – гэта адна з асаблівасцей беларускай публіцыстыкі пачатку XX ст. Прычына такога светаўспрымання хаваецца ў самім характары беларускай нацыі, яе ментальнасці. Спакон веку пастаянная барацьба за выжыванне, складаныя гістарычныя і сацыяльна-палітычныя ўмовы прытупілі ў народзе пачуццё ўласнай годнасці, веру ў свае сілы.

У пацвярджэнне гэтых разважанняў можна прывесці яшчэ адзін матэрыял, які ў 1913 г. змясціла «Наша ніва» пад назвай «Нашы цэннасці». Аўтар (пад даволі красамоўным псеўданімам «Лішні») імкнуўся разабрацца, якія каштоўнасці мелі беларусы на той час, якія шансы называцца нацыяй. У іх не было матэрыяльных набыткаў, уласнай царквы, але без гэтага народ можа існаваць. Важней тое, што беларусы захавалі сваю мову (праз якую выхоўваецца пачуццё нацыянальнага адзінства), уклад жыцця, сваю гісторыю, нават беларускую дзяржаўнасць. Няхай і слабыя, але ў народа захаваліся нацыянальныя традыцыі, а побач з імі і агульначалавечыя ідэалы. Бяда ў тым, што не навучыліся беларусы ўсім гэтым як след распараджацца,

цаніць усё гэта: «І выходзіць, што мы маем цела (народ з інстытуцыйнымі цэннасцямі), але гэтае цела, каб ажывіць, патрэбен жывы дух, патрэбны ідэалы паўнацэнныя, усясветныя, прапушчаныя праз нашу нацыянальную прызму. Каб заваяваць месца ў агульналюдской культуры, мы павінны не толькі браць з агульналюдской скарбніцы, але і класці ў яе раўнацэннае» [«Наша ніва», 1913, № 22].

Самым складаным для беларусаў на той час аказалася паверыць у свае сілы. Вельмі доўга прыйшлося тлумачыць людзям, што яны маюць абсалютна ўсё, каб жыць паўнацэнна. У 1914 г. газета «Bielarus» пісала: «Кожнаму народу, каб быць народам, трэба мець сваю гісторыю, сваю мову і свой асобны нацыянальны характар, – а гэта ўсё беларускі народ мае, значыць, ён – народ». І далей аўтар гаворыць самае галоўнае – тое, дзеля чаго і ажыццяўляецца ў краі нацыянальная работа: «А калі народ той мае свой асобны, нацыянальны характар, то і развіццё яго павінна быць асобнае, асобнае ад развіцця другіх народаў, бо павінна абапірацца на яго адметны нацыянальны характар» [«Bielarus», 1914, № 9].

Развіццё народаў, як сведчыць гісторыя, адбываецца толькі на ніве нацыянальнай свядомасці. З самага пачатку сваёй дзейнасці рэдакцыі беларускіх выданняў быццам бы і разумелі гэта палажэнне, і прыкладалі нямала намаганняў, каб рухаць наперад гэту справу. Аднак сумненняў было нямала, і яны зноў і зноў з'яўляліся на старонках газет: «Мы не ведаем, як і куды ісці, што ўзяць на дарогу са скарбаў сваіх... Мы можам. Мы павінны быць прарокамі, апосталамі новага жыцця, але пакуль што яшчэ не зрабіліся імі» [«Раніца», 1914, № 1].

Спрабуючы вызначыць асноўныя накірункі развіцця беларускай публіцыстыкі ў пачатку XX ст., нельга не прыняць пад увагу адну яе вельмі важную асаблівасць. Беларуская інтэлігенцыя і нацыянальны рух не імкнуліся ў сваёй рабоце да распрацоўкі тэорыі абсалютнага суверэнітэту Беларусі. Яны марылі пра культурна-нацыянальную аўтаномію краю ў межах Расіі. Па гэтай прычыне большасць публіцыстычных выступленняў схілялася ў бок культурна-асветніцкай працы, а не палітычнай: «Найлягчэйшай і канчатковай дарогай да самаразвіцця, да культурнага жыцця ёсць для народа развіццё сваёй нацыянальнай душы, нацыянальнай культуры» [9, с. 83].

Прыступаючы да работы над сваім чарговым матэрыялам, аўтары, магчыма, нават і падсвядома рабілі вывады аб тым, што ўся нацыянальная праца марная, калі яна не будзе накіравана на змаганне за поўную незалежнасць Беларусі. І гэта меркаванне гучала практычна ў кожным нумары газеты ці часопіса, які выходзіў у свет.

Ідэя беларускай дзяржаўнасці абгрунтоўвалася таксама і тым, што неабходнасць вынікае ўжо сама сабой з усведамленнем народам сваёй розніцы ад суседзяў, гэта самастойнасць вынікае з эканамічных і геапалітычных умоў Беларусі, адрозных ад умоў іншых рэгіёнаў Расіі, з

менталітэту самога народа. У свой час М. В. Доўнар-Запольскі пісаў: «Асновы беларускай дзяржаўнасці глыбока заложаны ў самім беларускім народзе і трымаюцца на моцных фундаментах – гістарычных, этнаграфічных, лінгвістычных і эканамічных, яны выяўляюцца ва ўсёй мінуўшчыне Беларусі» [25, с. 8].

У 1910-х гг. нацыянальны рух выйшаў за межы нашага краю. Беларускім адраджэннем зацікавіліся іншыя народы. Паказальным стала і тое, што гэта справа віталася, прымалася большасцю прагрэсіўнай грамадскасці. З'явілася рэальная надзея на будучыню. Больш таго, беларусы к гэтаму часу змаглі зрабіць вельмі шмат, нягледзячы на жорсткія палітычныя ўмовы, пастаянныя напады з боку расійскага і польскага ўрадаў. З гэтай нагоды ў 1913 г. «Наша ніва» пісала: «Цяпер Еўропай і ўсім адукаваным светам народ наш прызнаны за народ асобны, самабытны ў славянскай сям'і. На прызнанне нас асобнай нацыяй мы маем усе вартасці: гісторыю, мову, абычаі... – Далей рэдакцыя з гонарам падкрэслівала. — Цяпер ужо мы маем 4 часопісы: 2 газеты, 1 месячнік і 1 навуковы літаратурны штукарны альманах, і апроч гэтага выходзяць друкам літаратурныя творы лепшых аўтараў» [«Наша Ніва», 1913, № 47].

Культурна-асветніцкая праца, якую вялі дзеячы беларускага руху, дала свае вынікі. Нацыянальная прэса, нацыянальная літаратура – гэта значныя заваёвы народа на ніве нацыянальнага адраджэння. Дзеячы БСГ знаёмілі сусветную грамадскасць з асаблівасцямі беларускага пытання. Так, аб беларускай справе пачулі яшчэ ў 1905 г. на міжнароднай канферэнцыі сацыялістычных партый у Фінляндыі, на Усерасійскім сялянскім з'ездзе ў 1906 г., праз шэраг публікацый у рускім, польскім, украінскім, літоўскім, чэшскім, нямецкім друку.

Асобную ўвагу трэба звярнуць на такі факт: яшчэ ў 1904 г. у венскім нямецкамоўным часопісе «Рутэнішэ рэвю» быў надрукаваны артыкул І. Луцкевіча «На смерць асуджаная Беларусь» (пад псеўданімам Геб. Палісандэр). Існуе меркаванне, што гэты матэрыял з’яўляецца фактычна першай у XX ст. на заходнееўрапейскім абшары навуковай публікацыяй беларуса аб сваёй краіне [37, с. 106]. Аўтар матэрыяла прапаноўваў замежным чытачам сціслы агляд гісторыі і культуры Беларусі, расказваў пра яе багатыя творчыя традыцыі ад часоў Вялікага княства Літоўскага, уклад беларусаў ва ўзбагачэнне рускай і польскай культур, падкрэсліваў згубную ролю прымусовай асіміляцыі (пераважна з расійскага боку) у культурным заняпадзе народа. У артыкуле было выказана меркаванне аб неабходнасці ці нават неабарачальнасці нацыянальнага адраджэння беларусаў. Ёсць падставы сцвярджаць, што менавіта ў гэтай публікацыі ці не ўпершыню ў навуковы ўжытак было ўведзена само паняцце «беларускае адраджэнне». Паказальна і тое, што ў тым жа годзе матэрыял І. Луцкевіча быў перадрукаваны ў Англіі. Ужо зыходзячы толькі з гэтага факта, мы бачым, што падставы для нацыянальнага руху ў

беларусаў былі, і пачаўся ён яшчэ да рэвалюцыі 1905 г., а гэтыя падзеі толькі паскорылі працэс, дазволілі скіраваць яго ў патрэбнае рэчышча.

Прыведзеныя вышэй меркаванні даюць нам права разважаць аб значнасці беларускага нацыянальнага руху не толькі для ўласна беларусаў. Тым не менш, у сучаснай гістарычнай навуцы існуе меркаванне, што беларускае нацыянальнае пытанне ў маштабах іншых дзяржаў — з'ява надуманая. Так Я. Запруднік піша: «...канчаючы агляд пачатку стагоддзя, трэба падкрэсліць адсутнасць якога б там не было зацікаўлення з боку вонкавага свету беларускім пытаннем. Бо не было самаго пытання. Рэдкія замежнікі калі і заўважалі нейкую этнічную дыферэнцыяцыю на заходніх ускраінах імперыі, дык бачылі там апрача палякаў «малых», «белых» і «вялікіх русаў» [31, с. 5].

Так, абставіны складваліся не заўсёды на карысць беларусаў. Часта беларускі рух не прымаўся ўвогуле або сустракаўся варожа. Ён не заўсёды быў даспадобы ўрадам некаторых краін. У свой час рэдакцыя «Нашай нівы» звярталася (зварот адрасаваны 21 студзеня 1907 г.) у Лондан да кіраўніцтва польскай сацыялістычнай партыі (ППС) з просьбай падтрымаць беларускі рух і саму газету, якая ў перыяд рэакцыі перажывала не лепшыя часы. Ліст уключаў таксама інфармацыю пра яе сацыяльную пазіцыю, палітычныя абствіны ў краіне, якія ўскладнялі жыццё беларускаму выданню. Там была таксама просьба аб матэрыяльнай дапамозе: даць 1000 рублёў на паўгода. На жаль, гэты ліст застаўся без водгуку. «Кіраўніцтва ППС наўрад ці было зацікаўлена мець справу з беларускім вызваленчым рухам, а беларускае пытанне разглядала хутчэй як рэгіянальную, «крэсавую» праяву пытання польскага» [37, с. 58].

Многія вядомыя расійскія вучоныя лічылі сябе «безумоўнымі прыхільнікамі беларускага руху». Захаваўся ліст вядомага філосафа-славіста А. А. Шахматава, тагачаснага члена Праўлення Расійскай акадэміі навук, старшыні аддзялення рускай мовы і славеснасці, да рэдактара і выдаўца «Нашай нівы» А. Уласава датаваны 12 студзеня 1908 г., у якім вучоны выказвае свае сімпатыі да беларускага адраджэння, а таксама прапанову аб адкрыцці Віленскага універсітэта і заснавання ў ім, побач з літвазнаўствам, беларусістыкі.

Паступова ў спрэчках, у жорсткай палеміцы з супрацьлеглымі ідэямі і поглядамі выпрацоўваўся ў Паўночна-Заходнім краі свой шлях да адраджэння, свой погляд на будучыню. Кірункі беларускага нацыянальнага руху пазначаліся ў публіцыстыцы пачатку XX стагоддзя: «Кожны беларус павінен шырыць на Беларусі друкаванае слова ў роднай мове. Няхай ён ведае, што і яго праца не прападзе задарма, што і ён уклаў сваю цагліну ў вялізны будынак культурнага багацця народа» [«Наша ніва», 1909, № 38]. Беларуская публіцыстыка міжрэвалюцыйнага перыяду з'явілася яскравым пацвярджэннем сур’ёзнасці і значнасці працы па дзяржаўным адраджэнні.

Падзеі першай сусветнай вайны паскорылі працэс завяршэння першага этапа беларускага адраджэння. Усеагульны крызіс, паступовы распад царскай імперыі ў выніку ваенных дзеянняў прыкметна ажывілі нацыянальна-дэмакратычны рух, спрыялі яго эвалюцыі ад агульнай ідэі свабоднай Беларусі да яе канкрэтызацыі ў напрамку дзяржаўна-незалежнага самавызначэння.

Падзел тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю на дзве зоны вайсковага супрацьстаяння Расіі і Германіі вымусіў адраджэнскі рух часова арганізацыйна раз’яднацца, ладзіць працу з улікам франтавых абставін. Сярод дзеячаў акупаванай немцамі Вільні беларуская нацыянальная ідэя злівалася з ідэяй магчымага ўзнаўлення дзяржаўнай уніі Беларусі і Літвы. У снежні 1915 г. быў выдадзены зварот «Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага». Тут жа, у Вільні, быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт у якасці арганізацыйнага цэнтра мясцовых беларускіх арганізацый. Ён здолеў наладзіць сувязі з літоўскім, польскім, яўрэйскім нацыянальнымі рухамі дзеля тэрытарыяльнай цэласнасці і непадзельнасці беларускіх земляў. У акупаванай немцамі Вільні на пэўны час закладваўся падмурак нацыянальнай сістэмы асветы (першыя беларускія школы, нацыянальныя курсы, гімназіі ў Вільні, Свіслачы і іншых мястэчках Віленшчыны, Гродзеншчыны, Беласточчыны). У лютым 1916 г. было наладжана выданне газеты «Homan», рэдактарам якой стаў В. Ластоўскі. Ад імя беларускай палітычнай арганізацыі «Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі» на міжнароднай канферэнцыі ў швейцарскай Лазане прагучаў «Мемарандум прадстаўнікоў Беларусі» (1916 г.). У прамове беларускіх дэлегатаў (І. Луцкевіч і В. Ластоўскі) да ўдзельнікаў міжнароднай сустрэчы абгрунтоўваліся правы беларускага народа на незалежнасць і дзяржаўную самастойнасць: «Цяпер, дзякуючы III-яй канфедэрацыі народаў, мы маем магчымасць першы раз за 120 гадоў заявіць цывілізаванаму свету аб поўнай нашай бяспраўнасці, ад якой мы пакутавалі ў Расійскай дзяржаве. Мы просім у цывілізаваных народаў спагады нам і падтрымкі, каб прымусіць да пашаны нашых нацыянальных і культурных правоў. Мы можам урэшце спадзявацца, што які б ні быў канец вайны, народы Еўропы памогуць нам забяспечыць Беларусі ўсе палітычныя і культурныя правы, якія дадуць нашаму народу магчымасць вольна развіваць свае інтэлектуальныя, маральныя і эканамічныя сілы, і што гэтыя правы дадуць нам магчымасць стаць гаспадарамі на нашай уласнай зямлі» [68, с. 28].

На працягу свайго выхаду газета «Homan» была ідэйным натхняльнікам беларускага нацыянальнага руху. На яе старонках адлюстроўваліся асноўныя погляды большасці дзеячаў адраджэння, якія ў гэты час якраз і згуртаваліся ў Вільні. Можна выказаць меркаванне, што на старонках гэтага выдання знайшлі лагічнае завяршэнне асноўныя палажэнні ідэі па нацыянальным адраджэнні.

У першым нумары, які выйшаў у лютым 1916 г., газета «Homan» прапанавала агляд развіцця беларускага кнігадрукавання і перыядычнага друку ажно з 1491 г. і адзначыла, што першыя важныя крокі да свядомага грамадзянскага жыцця беларусамі былі зроблены разам з выхадам газет «Наша доля» і «Наша ніва». Значэнне гэтых выданняў было настолькі вялікім, што чытаць, напрыклад, «Нашу ніву» ў той час забаранялася спецыяльна выдадзенымі цыркулярамі ажно трох міністэрстваў– асветы, унутраных спраў і духоўным ведамствам [«Homan», 1916, № 1]. Распачатая беларуская справа знайшла працяг ў віленскім асяродку нацыянальнай інтэлігенцыі.

Асаблівасці беларускага нацыянальнага руху «Homan» даследаваў у артыкуле «Да адной мэты». Рэдакцыя ўказвала, што беларускі рух у гэты час развіваўся па двух накірунках. Першы ўзначаліла «Наша ніва», а таксама тыя, хто аб’яднаўся вакол яе, — свядомыя сяляне, універсітэцкая моладзь, большая частка інтэлігенцыі. Клерыкальна-каталіцкі напрамак прадстаўлялі выдаўцы газеты «Bielarus». Разважаючы аб мэтах нацыянальнага адраджэння, газета пісала: «Само сабой разумеецца, што кожны з гэтых галоўных накірункаў беларускага руху разглядаў супольную ўсім ідэю адраджэння беларускага народа з іншага боку, іншай сваёй асобнай сцежкай. І гэты раздзел, гэта дыферэнцыяцыя руху найлепей сведчыць аб яго сіле, найлепей даводзіць, што справа беларуская зрабілася справай усенароднай» [«Homan», 1916, № 14].

Падзеі Першай сусветнай вайны намнога ўскладнілі палітычную абстаноўку ў Паўночна-Заходнім краі. Нават пагроза паражэння ў вайне не прымусіла ўрады Расіі і Польшчы адмовіцца ад сваіх прэтэнзій на беларускія землі. Нацыянальнае пытанне па-ранейшаму заставалася ў полі іх павышанай цікавасці, прадстаўнікі гэтых краін былі гатовы практычна да ўсяго, каб толькі не дазволіць беларусам адасобіцца. Газета «Homan» пісала: «Расейскі ўрад гатоў мірыцца з палякамі, але за цану смерці беларусаў як асобнага народа» [«Homan», 1916, № 3].

У гэты час голас прыхільнікаў беларускага руху станавіўся мацнейшым, больш настойлівым. На гэта было некалькі прычын. Па-першае, тая адносна «свабодная» абстаноўка, якая была створана ва ўмовах нямецкай акупацыі, давала магчымасць працаваць. Было зразумела таксама і тое, што гэты час хутка скончыцца, таму неабходна было працаваць як мага больш, каб паспець сказаць і зрабіць тое, што ў іншых абставінах зрабіць было б проста немагчыма. А па-другое, справа беларускага нацыянальнага адраджэння патрабавала таго, каб была скарыстана любая магчымасць яе паступовага руху наперад.

Кожная малая нацыя можа ўзняцца толькі тады, калі абапіраецца на трывалую нацыянальную свядомасць і яшчэ, калі ўрадавая сістэма больш моцнай дзяржавы-гаспадыні церпіць крах. У беларусаў быў рэальны шанс, які ні ў якім разе нельга было ўпусціць. Менавіта гэта імкнулася растлумачыць свайму народу рэдакцыя «Homana». У новых

умовах перад беларускім народам адкрылася дарога да культурнага вызвалення ад панавання над імі суседніх чужых культур: «І мы верым, што ў нашай старонцы хутка ўжо той час настане, калі народ наш вызваліцца з гэтай духоўнай няволі, як вызваліліся ад яе суседнія нам нацыі» [«Homan», 1916, № 5]. Таму неабходна было шмат працаваць, каб узгадаваць новае пакаленне на сваёй мове, захаваць традыцыі, эканамічна вызваліцца, ствараючы ўласныя таварыствы, кааператывы, эканамічныя саюзы.

Газета пастаянна напамінала сваім чытачам, што вельмі важна ў цяжкую ваенную гадзіну быць разам і супольна дбаць пра будучыню: «Цяпер не час на тое, каб адна нацыя, карыстаючыся выпадковай перавагай, старалася заціснуць, заглушыць голас другой – слабейшай: цяпер павінны мы не сварыцца, а будаваць сабе новую будучыню, каб для ўсіх у нашым краю было месца» [«Homan», 1916, № 6].

Газета змяшчала шмат матэрыялаў, у якіх імкнулася падняць маральны дух беларусаў, указаць на іх лепшыя чалавечыя і нацыянальныя якасці. У № 7 за 1916 г. яна апублікавала матэрыял пад назвай «Тутэйшыя». Тут аўтар артыкула даваў падрабязнае тлумачэнне феномену «тутэйшасці» на Беларусі. Справа ў тым, што ў XIX – пачатку XX ст., пераважна ў паўднёва-заходнім і цэнтральным рэгіёнах Беларусі, сярод непісьменных і малапісьменных сялян, гараджан была пашырана лакальна-тэрытарыяльная саманазва «тутэйшыя», якую нават асобныя прадстаўнікі інтэлігенцыі ўспрынялі як універсальны беларускі этнонім. Значная частка сялян у той час вызначала сябе «тутэйшымі», «тубыльцамі» або «наськімі», а не беларусамі, рускімі, палякамі. Аўтар настойваў на меркаванні, што распаўсюджанне сярод беларусаў гэтай назвы ні ў якім разе нельга лічыць паказчыкам нізкай духоўнай культуры народа. Беларусы любяць менавіта свой край, таму і звязваюць сваё месцазнаходжанне толькі з ім. Тутэйшым называе сябе беларус, бо сапраўды ў роднай старонцы ён тутэйшы, а не чужынец. Тутэйшымі называе ён і ўвесь свой край, бо доўгае панаванне чужых не забіла ў ім свядомасці, што тут – не Расія, не Польшча, а “свая ўласная” старана – Беларусь» [«Homan», 1916, № 7]. Далей аўтар выказваў думку, што, нягледзячы на магутны ўціск суседніх дзяржаў, беларусы не паддаліся поўнай асіміляцыі.

На самой жа справе, у нашай гісторыі ўсё склалася крыху іначай. Феномен «тутэйшасці» стаў сапраўднай трагедыяй для нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Усё гэта знайшло вобразнае адлюстраванне ў знакамітай п’есе Я. Купалы «Тутэйшыя» (1922 г.). Звяртаючыся да праблемы, Э. Дубянецкі пісаў, што распаўсюджанне гэтага тэрміна сведчыла пра вельмі нізкі ўзровень менавіта нацыянальнай самасвядомасці значнай часткі беларускага народа ў перыяд, калі паступова пашыраўся беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, узрастала колькасць нацыянальна-свядомых людзей – найперш сярод інтэлігенцыі, шляхты, разначынцаў. Аднак даследчык не лічыць

вызначэнне «тутэйшасці» для беларусаў поўнасцю негатыўным. Такой думкі ў свой час прытрымліваўся і Ф. Шантыр у працы «Патрэбнасць нацыянальнага жыцця для беларусаў і самаадзначэння народу», называючы «тутэйшасць» добрай якасцю, адзнакай прыналежнасці да краю. Такім чынам, названая публікацыя знайшла сваіх прыхільнікаў і ў наш час, паколькі закранула адно з самых набалелых пытанняў для беларускага народа. Праца, якую вяла рэдакцыя «Homana», садзейнічала адраджэнню Беларусі, дапамагала паверыць ва ўласныя сілы.

Газета змясціла таксама і шэраг публікацый, якія сваім зместам не маглі быць прыхільна сустрэты большасцю нашых суайчыннікаў. Падзяка нямецкаму ўраду за апеку над беларускім рухам у той час, калі лілася кроў і гінулі тысячы людзей, выглядала як здзек над народам. У № 6 за 1916 г. рэдакцыя надрукавала паведамленне аб тым, што фельдмаршал Гідэнбург, галоўнакамандуючы Ўсходнім фронтам, выдаў указ аб адкрыцці школ. Ва ўказе гаварылася, што беларуская мова, як адметная ад расійскай, дапускаецца да ўжытку без ніякіх перашкод. Гэта адна з прычын таго, што выданне так і засталося ў нашай навуковай літаратуры маладаследаваным. Гаварыць пра «Homan» быццам бы саромеліся, лічылі гэта не да месца. Рэдакцыя газеты разам з В. Ластоўскім апынулася сярод «няўгодных». У савецкія часы гістарычная навука асуджала выданне за яго «нацыяналістычныя пазіцыі» [43, с. 30].

Так, са згоды нямецкага камандавання адкрываліся беларускія школы, у царкве дазвалялася весці богаслужэнне па-беларуску. Газета друкавала шмат паведамленняў аб тым, што нямецкія выданні распаўсюджвалі матэрыялы аб беларускім руху, спачувалі беларусам, падтрымлівалі іх у гэтай справе [«Homan», 1916, № 3, № 5, № 7, № 8, № 9 і г. д.].У адным з такіх артыкулаў рэдакцыя расказвала, што нямецкія газеты ўсё часцей пішуць пра беларускі рух, лічаць яго вельмі значным, выказваюць упэўненасць, што беларуская справа знойдзе яшчэ лагічнае завяршэнне і будзе садзейнічаць краху Расійскай імперыі. У якасці прыклада прыводзіўся факт, што Напалеон пацярпеў свае першыя няўдачы менавіта ў Беларусі [«Homan», 1916, № 17].

Нягледзячы на няпростую сітуацыю, выкліканую часам вельмі жорсткімі выказваннямі ў свой адрас, рэдакцыя «Homana» здолела захаваць магчымую долю аб'ектыўнасці. Газета была адрасавана народу і імкнулася даказаць гэта. Людзі стаміліся ад вайны, яны больш не давяралі ўраду, марылі жыць і вучыцца ў свабоднай і незалежнай краіне. Аб гэтым таксама пісаў «Homan»: «Беларуская прэса – гэта не катэдра, з каторай жменя ідэалістаў абвяшчае народу новыя думкі: гэта голас тых мільёнаў гарапашнікаў, каторых заўсёды гналі і ўціскалі, каторых дзяржалі ў цемры і бяспраўнасці, каторымі пагарджалі, над каторымі здзекваліся і смяяліся» [«Homan», 1916, № 73].

Палітыка нямецкіх улад аказала ў пэўным сэнсе станоўчы ўплыў на ўмацаванне пазіцый беларускай мовы, развіццё асветніцкай дзейнасці, распаўсюджанне ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння. Так, у выніку скасавання забароны на беларускую мову на акупаванай тэрыторыі было адкрыта каля 300 беларускіх школ, пачала работу ў м. Свіслач Гродзенскай губерні першая беларуская семінарыя, у Вільні ўзнавіла дзейнасць забароненае ў свой час Беларускае выдавецкае таварыства. Быў створаны шэраг беларускіх арганізацый, у іх ліку Беларускі клуб, Таварыства дапамогі бедным дзецям «Золак», Навуковае беларускае таварыства, Беларускі настаўніцкі саюз і інш.

Не трэба думаць, што нямецкія ўлады клапаціліся аб развіцці і росквіце нашай культуры. «Справа ў тым, што немцы былі зацікаўлены падарваць і паменшыць расійскі ўплыў на Беларусі. Абмежаванні пры карыстанні рускай мовай і свабоднае ўжыванне беларускай мовы якраз адпавядалі гэтым намерам. А паколькі рускую мову замяніць нямецкай было немагчыма, таму немцы і пайшлі на скасаванне ўсіх абмежаванняў у адносінах да беларускай мовы» [47, с. 12].

Тым не менш, менавіта газеце «Homan» было наканавана ў гэты складаны час узначаліць, а потым і завяршыць першы этап вялікай працы па адраджэнні беларускага народа. «Патрэба газеты адчуваецца наймацней тады, калі наступаюць часы важных перамен, калі ідзе справа аб долі народаў. Беларускі край цяпер перажывае якраз такі вялікі гістарычны момант: перад намі адкрываецца шырокі прастор для працы, і ў гэты момант больш, чым калі, патрэбна нам беларуская газета» [«Homan», 1916, № 1]. Усплеск адраджэнскай актыўнасці, звязаны з дзейнасцю віленскага асяродка нацыянальнай інтэлігенцыі, стаў апошнім напярэдадні лютаўскай і кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г.

Выкарыстаўшы адносна спрыяльныя палітычныя ўмовы, лідэры беларускага нацыянальнага руху здолелі зрабіць вельмі шмат для адраджэння сваёй краіны і яе народа. Рэдакцыя «Homana» імкнулася вярнуць асновы дзяржаўнасці, страчаныя за час панавання ў Беларусі чужынцаў. Выдаўцы газеты яшчэ раз даказалі, што друкаванае слова валодае магутнай сілай, здольнай зрушыць з месца прыгнечаны народ, разбудзіўшы ў ім пачуццё нацыянальнай годнасці, імкненне да адраджэння самасвядомасці, жаданне змагацца за ўсталяванне ў краіне асноў нацыянальнай дзяржаўнасці.

Беларуская публіцыстыка на мяжы дзвюх рэвалюцый адлюстроўвала важнейшыя грамадска-палітычныя працэсы, якія адбываліся ў краіне. Галоўная ўвага нацыянальнага друку была скіравана на развіццё адраджэнскага руху, сутнасць якога заключалася ва ўмацаванні ў Беларусі асноў незалежнай дзяржавы.

Распрацоўваючы тэорыю нацыянальна-культурнай аўтаноміі Беларусі, беларускі легальны друк актыўна змагаўся за вяртанне народу яго законнага права размаўляць і вучыцца на роднай мове. Моўная

праблема на старонках газет перастала быць толькі культуралагічнай, а і атрымала вострае палітычнае гучанне.

Шлях да незалежнасці Беларусі ляжаў, на думку публіцыстаў, праз развіццё ўсіх галін гаспадаркі. Гэта павінна было дапамагчы вызваліцца ад палітычнага і эканамічнага ўплыву суседніх дзяржаў – Расіі і Польшчы.

На старонках першых легальных нацыянальных выданняў у пачатку XX ст. ішла распрацоўка тэорыі дзяржаўнага суверэнітэту. Паняцце «нацыянальная ідэя» пастурова ўваходзіла ва ўжытак і ўключала ў сябе ўсю сукупнасць палажэнняў па нацыянальна-культурным і дзяржаўным адраджэнні Беларусі, першы этап якога завяршыўся напярэдадні 1917 г.